# І яшчэ адно імя...

***17 лютага ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбылася прэзентацыя кнігі «Божы дар Івана Кандрацьева» загадчыка кафедры культуралогіі гэтай установы прафесара Аляксандра Смоліка. Яе арганізавалі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і ўніверсітэцкая бібліятэка. Тут сабраліся навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі і студэнты, госці, журналісты многіх СМІ. Прафесар А. Смолік распавядаў пра сваю працу над кнігай.***

У наш складаны бурлівы час многія імёны вяртаюцца з небыцця, і гэта вельмі добрая прыкмета. Да такіх выдатных асобаў адносіцца і Іван Кандрацьеў – выдатны пісьменнік, перакладчык, краязнаўца. Нарадзіўся ён у 1849 годзе ў вёсцы Каловічы (цяпер Вілейскі раён). З маленства выявіліся яго творчыя здольнасці. Калі юнаку было 19 гадоў, газета «Віленскі веснік» надрукавала яго першы верш. Так склалася, што асноўная частка творчага жыцця Івана Казіміравіча звязаная з Масквой. З 1870-х гадоў яго вершы, раманы, апавяданні палі з'яўляцца ў шматлікіх маскоўскіх выданнях. Вызначыўся І. Кандрацьеў і як акцёр і драматург. Калі служыў акцёрам трупы Народнага тэатра А. Фядотава, напісаў гістарычную драму «На Паволжы», за якую атрымаў Вялікі залаты медаль. Наш зямляк з'яўляецца аўтарам раманаў «Салтычиха», «Гунны», двух зборнікаў паэзіі «Думы и были» і «Под шум дубрав», гістарычных нарысаў «Седая старина Москвы», дзіцячай чытанкі «Искра Божия». Мала хто ведае (а да нядаўняга часу не ведаў і аўтар гэтага артыкула), што яму належыць тэкст добра вядомай песні «По диким степям Забайкалья», а таксама словы дзівосных рамансаў «Очаровательные глазки» і «Эти очи – тёмны ночи». Зразумець, якой выдатнаю асобай быў І. Кандрацьеў, можна і па тым, што яго сябрамі былі пісьменнікі Уладзімір Гіляроўскі, Мікалай Успенскі, мастакі Васіль Сурыкаў, Ісаак Левітан, Аляксей Саўрасаў і іншыя вядомыя людзі таго часу. І хаця пісаў І. Кандрацьеў на рускай мове, але амаль у кожным яго творы прысутнічала апісанне роднай беларускай прыроды, мілых сэрцу мясцінаў.

Ды і жыхары гэтых мясцінаў Вілейшчыны даведаліся пра знакамітага земляка, толькі калі выйшла кніга А. Смоліка «Божы дар Івана Кандрацьева». Па крупіцах збіраў вучоны звесткі пра І. Кандрацьева, рамантыка яго пошукаў запаліла для нас новую зорку – таленавітага пісьменніка, чыя паэзія і проза з'яўляюцца часткай і беларускай літаратурнай спадчыны. Дарэчы, А. Смолік таксама ўраджэнец вёскі Каловічы, толькі нарадзіўся ён на сто гадоў пазней за свайго выдатнага земляка. У маі 2013 года ў Вілейцы прайшлі першыя Кандрацьеўскія чытанні, а ў Каловічах у чэрвені 2012-га было зладжанае свята, прысвечанае земляку, і ўстаноўлены памятны знак.



*Здымак на ўспамін (другі справа А. Смолік)*



*А. Шагойка*

А на імпрэзе ў Мінску чыталі вершы І. Кандрацьева, студэнтка Марыя Гарбачова парадавала цудоўным выкананнем раманса «Очаровательные глазки». Цікавымі былі выступы Лідзіі Шагойка – загадчыцы музея гісторыі беларускай літаратуры, Вольгі Вярбіцкай – даследчыка песеннай творчасці І. Кандрацьева, Таісіі Сухоцкай і іншых. Ахвочыя маглі таксама набыць кнігу А. Смоліка з аўтографам, першая частка якой прысвечаная жыццёваму і творчаму шляху І. Кандрацьева, а другая змяшчае ўрыўкі з яго твораў. Выданне багата ілюстраванае і, безумоўна, зойме належнае месца сярод кніг пра выдатных людзей нашай Бацькаўшчыны.

*Лявон ЦЕЛЕШ.*
*г. Дзяржынск*